# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 32 (47), 07–13.12. 2006 г.

# ЖЫЦЦЁ КАЗУЛІНА ПАД ПАГРОЗАЙ

## ЗА ЧАС ЗНЯВОЛЕННЯ ЁН СХУДНЕЎ НА 40 КІЛАГРАМАЎ

**Былы кандыдат у прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін, які адбывае пакаранне ў калоніі "Віцьба"-3, распачаў галадоўку 20 кастрычніка. Да турмы ён важыў 105 кілаграмаў, калі пачынаў галадоўку – 91. На 47-ы дзень галадоўкі ён важыў усяго 65… Паводле словаў Ірыны Казулінай, якой дазволілі сустрэцца з мужам 4-га снежня, артэрыяльны ціск у яго ў той дзень быў 75 на 60, тэмпература цела 36,2 градуса, пульс 60.**

Паводле меркавання аднаго з лекараў, якое прыводзіцца на старонках недзяржаўных СМІ, хуткая страта вагі пагражае сур'ёзнымі парушэннямі. Пры ціску 75 на 60, на думку эксперта, могуць адмовіць ныркі. "Гэта крытычны ціск, пры якім немагчымая нармальная работа галаўнога мозга, могуць пачацца перабоі з сэрцам… пацыенту патрэбная экстрэная медычная дапамога!"

Адміністрацыя калоніі дазволіла жонцы спатканне з Казуліным з умовай, што яна паўплывае на яго, каб той спыніў галадоўку. Але паводле яе словаў, угаварыць Казуліна немагчыма, ён па-ранейшаму настроены рашуча. Асноўнае патрабаванне вязня – каб хоць адзіная краіна "Вялікай васьмёркі" (куды ўваходзяць вядучыя краіны Захаду і Расія – **рэд.**) выступіла з прапановай разгледзець сітуацыю ў Беларусі на Радзе бяспекі ААН.

Улады спрабуюць ігнараваць патрабаванні Казуліна і нават сам факт галадоўкі. Адміністрацыя калоніі доўгі час не дазваляла яму спатканняў з адвакатам і нават з сваякамі.

Лідэры апазіцыйных партый неаднаразова заклікалі Казуліна спыніць галадоўку.

У свой час ён быў прызначаны Аляксандрам Лукашэнкам на пасаду рэктара Белдзяржуніверсітэта, потым звольнены з гэтай пасады. На выбарах Казулін балатаваўся ў прэзідэнты і разам з іншым кандыдатам ад апазіцыі – Мілінкевічам – рэзка крытыкаваў кіраўніка дзяржавы. У прыватнасці, у сваім перадвыбарным выступе па БТ Казулін абвінаваціў яго ў датычнасці да знікнення некалькіх вядомых людзей.

Аляксандр Мілінкевіч днямі прапанаваў вылучыць Казуліна на атрыманне прэміі аўтарытэтнай праваабарончай арганізацыі "Міжнародная Амністыя".

Тым часам член Савета Рэспублікі Мікалай Чаргінец заявіў на прэс-канферэнцыі ў Мінску : "У Казуліна адбыўся нейкі перакос у мысленні. Я яго ўжо даўно ведаю. Разумны чалавек, адукаваны, але палез не ў тую сферу. Мне па-чалавечы шкада Казуліна і ягоную сям'ю".




**Экс-кандыдат у прэзідэнты** *Аляксандр Казулін спрабуе зарэгістравацца дэлегатам Усебеларускага сходу, скліканага Аляксандрам Лукашэнкам напярэдадні сакавіцкіх выбараў. Праз некалькі хвілінаў палітык будзе жорстка збіты аховай… Пазней, па абвінавачванні ў арганізацыі масавага шэсця 25 сакавіка, якое скончылася сутыкненнямі з міліцыяй, ён будзе асуджаны на пяць з паловай гадоў зняволення. Мінск, 2006 год.*

**Іншыя меркаванні пра галадоўку Казуліна – на стар. 2**

## АПЛЯВУХА ПУЦІНУ

### ВЫНІКІ САМІТУ СНД

► СТАР. 5

## СТОМЛЕНЫЯ СОНЦАМ

### АГЛЯД ДРУКУ

► СТАР.6

# ЧЫМ СКОНЧЫЦЦА ГАЛАДОЎКА КАЗУЛІНА?

**АЛЯКСАНДР ДАБРАВОЛЬСКІ, СУСТАРШЫНЯ АГП:**

## "ЧАЛАВЕК МОЖА СТРАЦІЦЬ ЖЫЦЦЁ"

Гэта самае балючае для мяне пытанне. Я не ведаю, чым галадоўка скончыцца. Я бачу ўсю бесперспектыўнасць патрабаванняў да ўлады. Але, на жаль, атрымліваецца, што і заходнія краіны, якія абяцалі паставіць пытанне ў Радзе бяспекі ААН, таксама не спяшаюцца гэтага рабіць. Так што не ведаю. Але ўсе рацыянальныя матывы не спрацоўваюць, калі чалавек можа страціць жыццё. Шмат крытыкаў у нас ёсць, шмат людзей, якія адзін аднаму добрага слова не скажуць. Але пры тым, што можна спрачацца наконт выканальнасці ўмоваў, знайшоўся адзіны чалавек, які гэтыя ўмовы паставіў і дамагаецца іх з рызыкай для жыцця. Вось і ўся праўда ў гэтай сітуацыі. Чым усё гэта скончыцца? Страшна пра гэта гаварыць нават.

**УЛАДЗІМІР, ВЫКЛАДЧЫК:**

## "ПАРА З ГАЛАДОЎКІ ВЫХОДЗІЦЬ"

Гэта чыстай вады піяр-акцыя. Ну, не вар'ят жа, сапраўды, Казулін, каб усур'ёз патрабаваць у Сідорскага пераняць уладу ў краіне. Мэта, відаць, была нагадаць пра сябе, каб не забыліся. Можа, з яго тэмпераментам, яму магло падацца, што яго недастаткова памятаюць. Ну, нагадаў. Мэта дасягнута. Цяпер пара з галадоўкі выходзіць.

**АНАТОЛЬ ЛЯЎКОВІЧ, ПЕРШЫ НАМЕСНІК СТАРШЫНІ БСДП "ГРАМАДА":**

## "СІТУАЦЫЯ КРЫТЫЧНАЯ"

Калі браць фізічны бок, то, канечне, сітуацыя крытычная. І яшчэ невядома, калі ён будзе спыняць галадоўку. І як ён будзе выходзіць з гэтай галадоўкі? Палітычна калі ацэньваць... У любым выпадку я хацеў бы адзначыць, што вынікі гэтай галадоўкі ўжо ёсць. Хаця б у тым сэнсе, што пра тое, што экскандыдат у прэзідэнты знаходзіцца ў турме і трымае так доўга галадоўку, ведае ўжо і Ўсход, і Захад. І Ўсход, і Захад зразумелі, як зразумелі многія лідэры ў нашай краіне (можа, яны пра гэта не гавораць і не афішуюць гэта), што Казулін, нягледзячы на тое, што знаходзіцца ў турме, з'яўляецца фактарам палітыкі ў Беларусі. І я думаю, што як фактар палітыкі фігура Казуліна будзе ўзмацняцца. Таму што, гэта самы жорсткі сёння і самы паслядоўны апанент кіраўніка дзяржавы.

**ВАЛЯНЦІНА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## "НІЧЫМ ДОБРЫМ ГЭТА НЕ СКОНЧЫЦЦА"

Нічым добрым гэта скончыцца не можа. Бо здароўе назад не вернеш. Рэзанансу, на які, магчыма, Казулін разлічваў, не атрымалася. І не магло ў нашых умовах атрымацца. Таму самае лепшае, чым усё гэта можа скончыцца – паступовае выйсце з галадоўкі.

**АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ, ЛІДЭР АБ'ЯДНАНАЙ АПАЗІЦЫІ:**

## "Я ЗАКЛІКАЮ ЯГО СПЫНІЦЬ ГАЛАДОЎКУ"

Частка патрабаванняў, што Казулін вылучыў, задаволеная, хоць і нязначная. Калі б Рада бяспекі ААН сітуацыю разгледзела... Але яна не разглядае асабістыя патрабаванні. Гэта не функцыя Рады бяспекі. Ёсць, насамрэч, патрабаванні, якія немагчыма выканаць. І я ў лістах да яго пісаў, і вам скажу, што галадоўка толькі тады мае сэнс, калі яна вельмі сур'ёзна падрыхтаваная інфармацыйна. Калі ўсе медыі толькі аб гэтым і гавораць. У нашых умовах гэта практычна немагчыма зрабіць. І таму я заклікаю яго спыніць галадоўку. А чым яна скончыцца, мне цяжка сказаць. Я не хацеў бы, каб ён падарваў сваё здароўе.

**ВАСІЛЬ, ЧЫНОЎНІК:**

## "УСЁ СКОНЧЫЦЦА ГАНЬБАЙ"

Гэта ўсё скончыцца ганьбай. Як і пачалося. У нас галадоўка апошнім часам становіцца такою ж папулярнай, як харакіры ў Японіі. Хто ў нас толькі не галадуе! Пратэстанты, каталікі, студэнты, палітыкі. Хіба толькі ТБМ паказвае сваю адарванасць ад народа. Чаму яны не галадуюць? Іх што, не хвалюе лёс роднай мовы? Трэба абвясціць галадоўку, пакуль мова не адродзіцца. Галадоўка – гэта пагроза самагубства. Была вядомая галадоўка актывістаў Ірландскай рэспубліканскай арміі (ІРА). Падчас яе памерлі, здаецца, шэсць чалавек. Яны патрабавалі цалкам выканальныя рэчы – каб іх прызналі палітвязнямі, напрыклад. Яны сваю пагрозу прывялі да выканання. У нас пакуль ніхто не памёр, дзякаваць Богу. Але ўсе гэтыя нашы галадоўкі ідуць ад безвыходнасці. Пачынаючы ад галадоўкі 1995 году ў парламенце. І галадоўка Казуліна – чарговая дзея гэтага спектакля. Чаму ён не пайшоў на сухую галадоўку, як у свой час Славамір Адамовіч? Альбо так хутка паміраць не хацелася, альбо не было поўнага даверу да Сідорскага? Хутчэй за ўсё, Казулін выйдзе з галадоўкі сам.

**АНДРЭЙ КЛІМАЎ, ПАЛІТЫЧНЫ ЗНЯВОЛЕНЫ:**

## "ПАЛІТЫК ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ"

Палітык, які прэтэндуе ў гэтай краіне на штосьці, павінен быць здаровым і пры свядомасці. А галадоўка – гэта, як правіла, крык адчаю. Сваёй галадоўкай ён паказвае, што ў нашай краіне ў бліжэйшыя 25 гадоў ніякіх перспектываў няма. Таму яму трэба тэрмінова выходзіць з галадоўкі і рыхтавацца да прэзідэнцкіх выбараў 2007 году. Кандыдат у прэзідэнты, здаровы мужык, замест таго, каб весці перапіску з выбарцамі... не ведаю, нармальным жыццём займацца, сябе захаваць для будучыні краіны, займаецца нейкім дзяцінствам. Ён павінен разумець, што адным сваім учынкам, тым, што ён пайшоў супраць улады на выбарах, ён ужо такі аўтарытэт заваяваў у народзе, які ніякімі галадоўкамі не заробіш.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "НЕ БАЧУ ПАЗІТЫЎНАГА ВЫЙСЦЯ"

Праўду сказаць? Нічым. Я не бачу, шчыра кажучы, тут ніякага пазітыўнага выйсця. Гэта можа скончыцца або смерцю, або нічым. Патрабаванні павінны быць такія, каб яны маглі быць выкананыя. У якое становішча гэтая галадоўка ставіць Лукашэнку? У гэтым выпадку альбо Лукашэнка адмаўляецца ад улады, альбо кажа: "Хай Казулін памірае – што я магу зрабіць?" Нават смерць Казуліна ў гэтай сітуацыі для яго больш прымальны вынік, чым задаволіць яго патрабаванні. Я нядаўна быў у Гродне, у парафіі, якой не даюць будаваць касцёл. Наведаў бабулек, якія там галадуюць. Яны высунулі патрабаванне выконваць 31 артыкул Канстытуцыі і даць дазвол на будаўніцтва храма. Гэтыя патрабаванні могуць быць выкананыя. Але большасць беларускіх галадовак былі неадэкватныя. На сённяшні дзень Казулін найбольш папулярны беларускі палітык. І калі ўжо так падыходзіць да сваёй ролі ў беларускай палітыцы, то трэба рабіць абдуманыя крокі. Гэтая галадоўка засяродзіць на ім больш увагі, але папулярнасці ці аўтарытэту не дадасць.

# БЕЛАРУСЬ МЯНЯЕ ГАЗАВАЕ ШЫЛА НА ЯДЗЕРНАЕ МЫЛА

## ПРАЗ 30 ГАДОЎ ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЮ БЕЛАРУСЬ ЗАЙМЕЕ ЎЛАСНУЮ АЭС?

Будаўніцтва плануецца завершыць да 2016 году. У якасці месца для атамнай станцыі ўжо вызначаная пляцоўка ў Краснаполлі Магілёўскай вобласці, ў ста кіламетрах ад мяжы з Расіяй. У якасці запасных варыянтаў разглядаюцца пляцоўкі ў Шклове і каля заходняй мяжы Беларусі.




Галоўным ініцыятарам будаўніцтва атамнай станцыі выступіў асабіста Аляксандр Лукашэнка, які спешна пачаў шукаць альтэрнатываў расійскім энергарэсурсам.

Пакуль што рашучы пратэст супраць планаў будаўніцтва АЭС выказала толькі расійскае аддзяленне экалагічнай арганізацыі "Грынпіс". Кіраўнік расійскай антыядзернай праграмы Уладзімір Чупроў сказаў у інтэрв'ю "КП в Беларуси": *"Трэба разумець, што будаўніцтва ўласнай АЭС не пазбавіць Беларусь ад залежнасці. Усё адно давядзецца недзе купляць паліва. Невядома, што танней. Атрымліваецца, што вашая краіна мяняе газавае шыла на ядзернае мыла. Потым яшчэ ёсць пытанне кошту захавання адпадаў. Украіна ўжо мае з гэтым цяжкасці: вывозіць адпрацаванае паліва на тэрыторыю Расіі даволі дорага. Будаваць уласны ядзерны магільнік – гэта недзе 60 мільярдаў даляраў. На гэтыя грошы можна столькі газу купіць!"*

Нагадаем, што яшчэ зусім нядаўна ўрад РБ катэгарычна пратэставаў супраць будаўніцтва ядзернага магільніка ў Літве, блізу беларускай мяжы.

Між тым, за мяжой выказваюцца апасенні, што Мінск можа пайсці шляхам Тэгерана і Пхеньяна і пад выглядам праграмы "мірнага атаму" паспрабаваць займець уласную ядзерную зброю, каб шантажаваць Захад.

Дарэчы, пасля Чарнобыльскай катастрофы і жахлівых наступстваў радыяцыі для насельніцтва само паняцце "мірны атам" наўрад ці пасуе Беларусі.

**Аглядальнік**

# "НЕ ВЕДАЮ, ЯК ПЕРАДАЦЬ, ЯК ВЫ ЗДЗЕКУЕЦЕСЯ З НАС"

## У БЕЛАРУСІ БЫЎ СВОЙ ГАЛАДАМОР

*Сёлета 28 лістапада Вярхоўная Рада Ўкраіны прыняла закон аб Галадаморы. Закон падпісаў прэзідэнт Віктар Юшчанка. Такім чынам, праз некалькі дзясяткаў гадоў упершыню на афіцыйным узроўні прызнаюцца трагічныя падзеі 1932-1934 гадоў, якія ўвайшлі ў гісторыю як Галадамор. У Беларусі быў свой Галадамор, які забраў тысячы жыццяў. Аб гэтым малавядомым эпізодзе нашай гісторыі напісала электронная газета "Е" ("Ежедневник").*

Першыя звесткі пра голад у Беларусі пачалі паступаць з лета 1932 году: *«Положение в районе [Туровском] с обеспечением хлебом нуждающейся части колхозников до чрезвычайности напряженное. Конец сева в этих [пограничных] колхозах характерен невыходами на работу по причине голодания и невозможности физически работать»* (Цыт. на мове арыгінала – рэд.). З лета 1933 г. сігналы з месцаў у цэнтр аб голадзе пачасціліся. Ва Ўшацкім раёне "многія калгаснікі ўжо цяпер не маюць хлеба і харчуюцца рознымі сурагатамі". У цяжкім становішчы, згодна з дакладной з Жыткавіцкага раёна, апынуліся 33 калгасы, або каля 4,5 тыс. чалавек. У 68-мі калгасах зоны Клімавіцкай МТС (машына-трактарнай станцыі – рэд.) з 4200 сем'яў 3000 не мелі ніякіх прадуктаў наогул.

У Пухавіцкім раёне *«во многих колхозах… положение с недостатком хлеба создалось неважное […], имеются случаи заболевания от голода, невыход на работу и т. д.»*. У калгасе «Перамога» Мінскага раёна *«колхозники в большинстве случаев питаются травой, которую варят и забеливают молоком. За последнюю неделю имеются случаи опухания у отдельных колхозников ног, рук, лица, и во время работы валятся с ног […]. Среди колхозников царят упадническое настроение и паника. Ожидают смерти и просят разных лиц забрать у них детей и спасти их от голодной смерти»*.

З пісьма, кваліфікаванага як антысавецкае, у рэдакцыю сенненскай райгазеты «Камунар»: *«Сами ходим голые, поели всю траву, липовый лист, брагу из Оболи и Янова, а с нас требуют молока, мясо […]. Не знаю, как передать, как вы издеваетесь над нами, писать есть чего да некому читать это: подумать, изгали ли Украину — теперь принялись за Белоруссию и послед смерть СТАЛИНУ, долой соци-*

**Працяг на стар. 4**

# МІЛІЦЫЯНЕРАЎ АСУДЗІЛІ ЗА ЗАБОЙСТВА

**Амаль два з паловай гады цягнулася справа чатырох полацкіх міліцыянераў і нарэшце скончылася тэрмінамі пакарання: тром па пяць гадоў пазбаўлення волі, а аднаму — чатыры.**

Суд у Глыбокім разгледзеў усе акалічнасці, заслухаў сведак, прааналізаваў вынікі шматлікіх экспертыз і прыйшоў да высновы, што 27-гадовы мужчына памёр ў міліцэйскім пастарунку ў выніку мардавання асобамі ў пагонах. Судмедэксперты пацьвердзілі — галоўнай прычынай быў моцны ўдар у сонечнае спляценне.

Праўда, асобу міліцыянера, які нанёс смяротны ўдар, высветліць не ўдалося, таму свае тэрміны ўдзельнікі расправы атрымалі, у першую чаргу, за перавышэнне службовых паўнамоцтваў. Аператыўнікі з парушэннямі склалі пратакол, не накіравалі падазронага ў дзяжурную частку ці ізалятар часовага ўтрымання.

Замест гэтага прывезлі двух затрыманых братоў, якія святкавалі дзень нараджэння на беразе ракі Палаты, у будынак аддзела ўнутраных спраў, дзе развялі іх па розных памяшканнях і пачалі патрабаваць прызнання ў крадзяжы. Пазней да сваіх супрацоўнікаў падключыўся таксама намеснік кіраўніка крымінальнага вышуку. Па словах міліцыянераў, затрыманы імяніннік кідаўся на іх, лаяўся, таму на яго начапілі „бранзалеты", пасля чаго малады чалавек „нечакана" згубіў прытомнасць. Калі прыехала хуткая дапамога, ён ужо сканаў.

Матулі памерлага палачаніна гарадскі аддзел унутраных спраў выплаціць 7 млн. рублёў кампенсацыі за маральную шкоду.

**Паводле Радыё Рацыя**

# "У ГАЛАДОЎКІ НЕМУЖЧЫНСКІ ТВАР"

## ЧАМУ Ў БЕЛАРУСІ ГАЛАДУЮЦЬ?

У Гродне трымаюць постгаладоўку вернікі Рыма-каталіцкай суполкі Найсвятой Панны Марыі Вастрабрамскай, Маці Міласэрнасці. Амаль дзесяць гадоў суполка не можа атрымаць дазвол на ўзвядзене новага касцёла. Увесь гэты час мясцовыя ўлады абяцаюць вырашыць праблему, але рукі выканкамаўскіх чыноўнікаў, быццам бы, да яе не даходзяць. Цярплівасць католікоў скончылася.

Акцыю пратэсту ўзначаліў ксёндз Аляксандр Шэмет. У першы дзень зімы да галадоўкі далучыліся адзінаццаць прыхаджанаў яго парафіі. Галадоўка праходзіць у будынку капліцы. Праз некалькі дзён у ёй удзельнічалі ўжо 13 чалавек. Дзьвюм пажылым кабетам амаль адразу давялося галадоўку спыніць з-за пагрозы гіпертанічнага крызу.

Увогуле, упершыню ў гісторыі Беларусі галадуюць людзі старэчага веку – найстарэйшай удзельніцы паста 79 гадоў. Прычым, за выключэннем Аляксандра Шэмета, галадоўку трымаюць толькі жанчыны. Мужчыны, паводле словаў айца Аляксандра, пакуль баяцца…

Хваля галадовак захліснула Беларусь. Беларусы ўсё часцей звяртаюцца да гэтай, амаль што скрайняй меры для таго, каб выказаць сваю нязгоду з палітыкай уладаў. Праўда, галадавалі і раней – шмат хто памятае акцыю пратэсту прадпрымальніка Аўтуховіча і некалькіх ваўкавыскіх таксістаў. Аднак, гэтулькі масавых галадовак, якія цяпер практычна змяняюць адна адну, да апошняга часу не было

Чаму ж беларусы галадуюць? З аднаго боку, таму што галадоўка засталася адзінай непадсуднай формай рэакцыі на дзеянні ўладаў – яны пакуль яшчэ не дадумаліся заканадаўча прыраўнаць яе да масавых акцыяў пратэсту і ўвесці за яе крымінальную адказнасць. З другога боку, гэты метад дазваляе дамагчыся хоць нейкіх вынікаў. Успомнім галадоўку брэсцкіх індывідуальных прадпрымальнікаў – уладальнікаў маршрутных таксі, якія выступілі супраць так званага рэспубліканскага збору на ўвоз у краіну транспартных сродкаў у камерцыйных мэтах. Успомнім галадоўку актывістаў Беларускага незалежнага прафсаюза на «Белшыне», якія адстойвалі правы сяброў гэтай арганізацыі, галадоўку пратэстантаў царквы "Новае жыццё", якія абараняюць ад Мінгарвыканкама свой храм. Удзельнікам усіх гэтых акцыяў удалося хаця б часткова дамагчыся выканання сваіх патрабаванняў.

Напрыклад, сябрам незалежнага прафсаюза "Белшыны" ў Бабруйску адміністрацыя пачала выплочваць прэміі, ад чаго адмаўлялася раней. Удалося дамагчыся некаторых саступак чынавенства і брэсцкім прадпрымальнікам. Мінскім пратэстантам пасля шматдзённай галадоўкі справу аб пазбаўленні іх зямлі і будынка узяў на перагляд Вышэйшы гаспадарчы суд. Усе галадоўнікі атрымалі хоць і маленькую, але перамогу.

Каталікі, якія распачалі галадоўку ў Гродне, не хаваюць, што на гэта іх натхніў прыклад вернікаў суполкі "Новае жыццё".

А ўлады цяпер сутыкнуліся са складанай дылемай – альбо выконваць патрабаванні галадоўнікаў, і тым самым падштурхоўваць людзей да новых акцыяў пратэсту, альбо спакойна назіраць, як іх удзельнікі губляюць сілы і здароўе. Дагэтуль смяротных выпадкаў у выніку галадовак пратэсту ў Беларусі не было.

Але варта памятаць, удзельнікі галадоўкі ў Гродне – пераважна людзі сталага веку. Большасць іх, хутчэй за ўсё, не пратрымаюцца і сарака дзён. Што ж рабіць уладам? Праяўляць "слабасць"? Ці выступіць, хай і ўскосна, у ролі катаў? А як інакш іх можна назваць? Бо ніхто з галадоўнікаў у Беларусі не патрабаваў нічога надзвычайнага. (За выключэннем, мабыць, Казуліна.) Толькі выканання сваіх элементарных правоў.

**Марат Грымаў**

*P.S.* 6-га снежня на імя біскупа Гродзенскай дыяцэзіі Аляксандра Кашкевіча прыйшоў афіцыйны ліст за подпісам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі з дазволам на пабудову касцёла. Пасля гэтага вернікі спынілі акцыю пратэсту. На той момант у ёй удзельнічалі 16 чалавек.

**М.Г.**

# "НЕ ВЕДАЮ, ЯК ПЕРАДАЦЬ, ЯК ВЫ ЗДЗЕКУЕЦЕСЯ З НАС"

**Пачатак на стар. 3**

*ализм»*.

Калі ў 1932-м годзе асноўную масу галадаючых складалі ўкраінцы, дык у 1933—1934 гадах да іх далучыліся беларусы. Так, жыхары Жыткавіцкага раёна ехалі ў пошуках хлеба ў Бабрусйк, Слуцк, Тураў, Петрыкаў, Старобін і інш., ва Ўкраіну. Аднак трывожыла такая сітуацыя ўлады перш за ўсё таму, што "гэты рух за хлебам не толькі шкодны палітычна, але ён шкодны з пункту гледжання гаспадарчага, бо адцягвае з калгасаў шмат рабсілы, ставячы некаторыя з іх у цяжкае становішча пры выкананні дзяржаўных заданняў (лесараспрацоўкі)".

Хлебанарыхтоўкі, нягледзячы ні на што, былі выканаyя.

У 1938 годзе НКВД падсумоўваў вынікі разгрому «антысавецкага падполля" у БССР. Сярод асноўных абвінавачанняў – шкодніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. Гэта дало магчымасць спісаць на "ворагаў народа" і "шкоднікаў" голад. Паводле гэтага дакумента, толькі ў Нараўлянскім раёне за 1932—1933 гады памерла да 1000 чалавек. Гэта фактычна адзіная лічба, якую ўдалося знайсці ў архіўных дакументах аб колькасці ахвяраў голаду, інспіраванага Масквой на тэрыторыі БССР.

Трагедыя палягала на тым, што ўлада факт голаду не прызнавала, таму не было размовы і аб ратаванні людзей: няма голаду – няма праблемы. Аднак дзеля заспакаення грамадскай думкі былі расстраляныя 10 кіраўнікоў Наркамата земляробства СССР, рэпрэсавана шмат рэспубліканскіх, абласных, сельсавецкіх і калгасных кіраўнікоў "за арганізацыю голаду ў краіне".

**Ад рэдакцыі***: Украіна нядаўна афіцыйна падала дакументы ў Арганізацыю аб'яднаных нацый з просьбай прызнаць Галадамор генацыдам украінскага народу. У Беларусі сёлета пад Мінскам пастаўлены помнік Сталіну, на сумленні якога мільёны ахвяраў – у іх ліку "раскулачаныя" беларускія сяляне, закатаваныя НКВД дзеячы беларускай культуры, усе расстраляныя, чые парэшткі ляжаць у Курапатах.*

# АПЛЯВУХА ПУЦІНУ

## ЦІ ЗАПРОСЯЦЬ У МІНСК САШУ БАРОНА КОЭНА?

“Да СНД патрэбныя крэатыўныя падыходы”, — заявіў напярэдадні саміту Садружнасці экс-кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Урал Латыпаў. Ягоныя былыя паплечнікі ўзброіліся гэтай думкай і зрабілі так, што шараговая сустрэча кіраўнікоў дзяржаў мела розгалас далёка за межамі СНД.

Насамрэч, уявіце сабе, што ўсё прайшло ціха: прэзідэнты сустрэліся, пагаманілі, чарговы раз вырашылі, што Садружнасць неабходна рэфармаваць і даручылі распрацаваць адпаведны праект праз паўгода. Рэакцыя грамадзянаў на такую лёсавызначальную падзею лёгка прагназуецца: “Дармаеды!” А менчукі маглі б дадаць яшчэ штосьці больш моцнае, бо тыя перашкоды нармальнаму руху транспарту, якія ствараліся ў сталіцы падчас саміту, закранулі шмат каго. Даходзіла да таго, што за паўгадзіны да з’яўлення чарговага картэжу на ягоным шляху блакаваліся падземныя пераходы. “А раптам вы там выбуховае прыстасаванне закладзеце!” – пачуў я з гэтай нагоды ад дзецюка ў форме.

**Гэтая трагікамедыя у пэўным сэнсе выканала сваю функцыю: адцягнула ўвагу ад таго, што непасрэдна на саміце не адбылося… анічога . Саміт згадвалі, галоўным чынам, менавіта дзякуючы скандалу, а не рашэнням, якія прынялі (дакладней – не прынялі) прэзідэнты.**

Але ўсе гэтыя побытавыя нязручнасці адышлі на другі план пасля скандалу з расійскімі журналістамі, якіх на пасяджэнне Рады кіраўнікоў дзяржаваў СНД не пусцілі. (Пра скандал мы падрабязна пісалі ў мінулым нумары газеты). Па праўдзе кажучы, рабіць такія захады афіцыйны Мінск права не меў, бо гэта была не яго ўласная вечарына, а мерапрыемства ў межах СНД. На міжнародных сустрэчах дзейнічаюць іншыя правілы. Таму Аляксандра Лукашэнку, якому забаронены ўезд у Злучаныя Штаты Амерыкі, усё-ткі пускаюць у ЗША, калі ён ляціць на сесію ААН. Аднак у сябе на радзіме ён вырашыў прадэманстраваць усім, хто ў доме гаспадар.




У выніку Пуцін атрымаў чарговую аплявуху ад Лукашэнкі. Прэзідэнт Расіі не здолеў абараніць журналістаў, якія прыляцелі разам з ім. Больш за тое, ніякай афіцыйнай рэакцыі расійскага боку фактычна не было. На брыфінгу для расійскіх журналістаў перад вылетам у Маскву Пуцін спаслаўся на словы Лукашэнкі, нібыта журналістаў не акрэдытавалі з-за тэхнічных непаразуменняў. Лепш бы гаспадар Крамля прамаўчаў, бо выступаць у ролі рэтранслятара лухты – надта няўдзячная рэч.

Але гэта была не апошняя ганьба для Пуціна ў той вечар. Прадстаўнікі БТ, якіх не пусцілі на брыфінг, вырашылі дамагчыся свайго і зрабілі засаду на прэзідэнта Расіі непасрэдна на лётным полі. У выніку Пуціну давялося зрабіць манеўр – вярнуцца з залы для ганаровых гасцей назад на вуліцу, сесці ў свой аўтамабіль і ўжо на ім дабірацца да самалёта!

Гэтая трагікамедыя у пэўным сэнсе выканала сваю функцыю: адцягнула ўвагу ад таго, што непасрэдна на саміце не адбылося… анічога . Саміт згадвалі, галоўным чынам, менавіта дзякуючы скандалу, а не рашэнням, якія прынялі (дакладней – не прынялі) прэзідэнты.

Цікава, што амаль адначасова разгортваўся скандал вакол стужкі “Борат”, у якой вядомы брытанскі комік Саша Барон Коэн у даволі своеасаблівай форме рэпрэзентаваў Казахстан. Выступаючы ад імя тамтэйшага журналіста Бората, ён распавядаў, што жыхары краіны Нурсултана Назарбаева п’юць конскую мачу і забаўляюцца паляваннем на неграў ды згвалтаваннямі. Цікавай была рэакцыя ўладаў Казахстана. Спачатку яны моцна пакрыўдзіліся: афіцыйныя асобы пачалі заяўляць пратэсты з нагоды жартаў Коэна, а ягоны сайт быў забаронены. Але потым уплывовая дачка Назарбаева Дарыга заявіла, што падобныя дзеянні наносяць Казахстану значна больш шкоды, чым сам комік. Таму пратэсты спыніліся, а нядаўна МЗС Казахстана афіцыйна запрасіў Сашу Барона Коэна наведаць гэтую краіну. Журналістам “Московского комсомольца” і “Коммерсанта” аналагічныя запрашэнні ад уладаў РБ яўна не пагражаюць.

**Валер Філін**

# СТОМЛЕНЫЯ СОНЦАМ

Саюздрук

## АЛЬБО КАМУ КРЫЎДНА ЗА КАЛІНОЎСКАГА?

Хто толькі апошнімі часамі на старонках афіцыйнага друку ні плюнуў у бок апазіцыі? Здаецца, усе, хто хацеў давесці сваю адданасць уладзе, засвяціліся. Не хапала толькі палымянага камуніста Віктара Чыкіна. Але нарэшце і ён прачнуўся. На старонках газеты "7 дней" таварыш Чыкін абрынуў свой публіцыстычны напалм на адукацыйную праграму Каліноўскага:

*"Зачем грызть гранит науки, сдавать вступительные экзамены, если обладателем студенческого билета без труда можно стать, единожды засветившись на не санкционированном властями митинге. Вот и бродят «абитуриенты» по улицам в поисках милицейского приемника-распределителя. Ведь сквозь решетки известного здания на минской улице Окрестина теперь хорошо видны огни многих европейских столиц. Да и от армии таким образом «откосить» можно. (…)*

*Чтобы устроиться в программу «халявного обучения на Западе», родителям «политизированных» чад пришлось заплатить энную сумму. Вот только почему программу назвали в честь Калиновского? Ведь он своими убеждениями не торговал и даже взошел за них на эшафот. Не лучше ли было назвать ее в честь Позняка Зенона Станиславовича? Не только потому, что вся оппозиция вышла из позняковской шинели, точнее, из его долгополого черного пальто, а потому, что именно он первым в Беларуси превратил оппозиционную деятельность в доходный бизнес. Наскандалил на Родине и теперь безбедно живет на Западе.*

*Как бы там ни было, но дело Позняка, заложенные им традиции, судя по всему, живут! А вот за Калиновского обидно!"*

Уяўляю сябе на месцы чытача гэтага артыкула звычайнага абываценля, бацькі будучых абітурыентаў – хлопчыка ці дзяўчынкі, якія могуць не паступіць у ВНУ. І не з-за адсутнасці ведаў, а з-за наяўнасці розных квотаў для іншых дзяцей. А маім, магчыма, прапануецца платнае навучанне. Плюс да гэтых немалых грошай дзецям у бясплатную нагрузку дадуць усялякую "картошку" ды абавязковае сяброўства ў БРСМ. Ці не задорага, падумаў бы я на месцы чытача. А ў рэкламным матэрыяле Чыкіна карціна зусім іншая. Заплаціць трэба адзін толькі раз – і тваё дзіця ў еўрапейскім універсітэце! Што б я зрабіў на месцы чытача? Я сказаў бы: "Сынок, вазьмі наш святы бел-чырвона-белы сцяг і ідзі па навуку да спадара Мілінкевіча. Там і бяруць танней і вучаць лепей".

Толькі вось наконт Каліноўскага "нязломны камуніст" Чыкін пакрывіў душой. Інакш хоць бы навучыўся пісаць па-беларуску. І не выступаць на старонках наскрозь зрусіфікаваных прыўладных газет.

Як сорамна і няёмка чытаць глупствы, прамоўленыя разумнымі і таленавітымі людзьмі. Але, як правіла, з вуснаў расійскіх творцаў зляятаюць суцэльныя банальнасці і некарэктнасці, калі яны пачынаюць гаварыць пра Беларусь. Чаму так адбываецца? З-за крывадушнасці ці чаго іншага? У "Звяздзе" рэжысёр Нікіта Міхалкоў прызнаваўся ў любові да Беларусі.

*"(… ) Думаю, што Мінск на сёння — гэта музей архітэктуры XX стагоддзя перыяду сацыялізму, не трэба тут шукаць іроніі. Я з цікавасцю і трапяткім настальгічным пачуццём глядзеў на гэты горад, які толькі таму такім стаў, што ўсё іншае было змецена з зямлі.*

*Я стаўлюся з вялікай павагай да беларускага народа. Зараз я здымаю «Стомленыя сонцам-2» і мне давялося пры падрыхтоўцы да фільма прагледзець гадзін пяцьдзесят хронікі. Павінен сказаць, што ўтрымаць нацыянальнае зерне, пранесці яго праз такія выпрабаванні — дарагога каштуе. Наша справа — разумець, адкуль выйшаў гэты магутны, бясстрашны, працавіты народ".*

Ці ведае спадар Міхалкоў, кім быў змецены з зямлі стары Менск і калі? У тыя самыя часы, якія навяваюць яму настальгічнае пачуццё. А чаго каштавала захаваць нацыянальнае зерне ў тыя ж "светлыя" часіны? Пра гэта ён, быццам, і не здагадваецца. Хоць і здымае фільмы на тэму сталінскае дыктатуры. Але ўсё роўна, дзякуй яму на добрым слове.

А ў "ЛІМ"е галоўны рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Віктар Праўдзін дзеліцца планамі на 2007 год.

*"Зараз у серыі "ЖЗЛБ" рыхтуецца выданне пра маэстра Міхаіла Фінберга. А ў планах на 2007 год – кнігі пра героя нашай краіны Міхася Савіцкага, пра Мікалая Чаргінца і Івана Шамякіна. У мінулым годзе ў серыі "ЖЗЛБ" мы выдалі Караткевіча і кампакт-дыск, дзе пісьменнік сам чытае свае вершы, спявае рамансы... Так што выдатныя творы мы і надалей будзем прадстаўляць і распаўсюджваць на лічбавых носьбітах, бо пэўная частка людзей, у асноўным моладзь, аддае перавагу не друкаванай прадукцыі, а чытае з дапамогай камп'ютэра".*

Рызыкну даць спадару Праўдзіну адну параду. Зрабіце, калі ласка, кампакт-дыск з песнямі ў выкананні Чаргінца. Гэта, прынамсі, можа хоць у нейкай ступені прыцягнуць увагу спажыўца да творчасці прэзідэнцкага чыноўніка.

**Алесь Канюціч**

# НЕ СПЯШАЙСЯ ЖЫЦЬ,

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО "ЁН МНЕ ПАНАРАВІЎСЯ"

Радыё Свабода абвясціла, што плануе павялічыць перадачу "Палітычная геаграфія" ў 2 разы. Правільнае рашэнне. У рэдакцыі, напэўна, ёсць свае ідэі, а я выкажу свае меркаванні.

Добра, каб гэта былі не два падарожжы ў розныя месцы, а адно вялікае – на паўгадзіны. Дзеля чаго? Каб даць нармальна пагаварыць тамтэйшым людзям. Цяпер гучаць караценькія абрывачкі – 1-2 фразы. А вось, напрыклад, у адной з апошніх перадач бабуля з мястэчка Сноў сказала: "ён мне панаравіўся". Надта смачна сказала. Такую бабулю трэба слухаць гадзінамі.

Не трэба забывацца за вёскамі пра гарадскія мікраёны. Адзін шматпавярховы дом – як вёска.

Нядаўна на Беласточчыне адбыліся мясцовыя выбары. У Польшчы нармальныя дэмакратычныя законы. І беларусы перамагаюць на выбарах. А як яны перамагаюць – Радыё Свабода не кажа. Дайце падрабязныя рэпартажы.

Зноў пра Радыё Свабода. Яно завершыла цыкл перадач пра палітычны крызіс у Беларусі 1996 году. Акрамя непасрэднае карысці ад гэтых гістарычных перадач, я меў яшчэ і карысць прыватную. Пачуў, як 10 гадоў таму гаварылі ў эфіры карэспандэнты Груздзіловіч і Цыганкоў. Нармальна гаварылі, стараліся. А прайшло 10 гадоў і – набілі руку, дакладней, язык і сталі мянціць шпарка-шпарка, глытаючы гукі і цэлыя склады. Так, напрыклад, слова "свабода" гучыць як "сабода", "канстытуцыйны" – як "касцыйны", а "сацыял-дэмакрат" – увогуле непрыстойна гучыць. Хочацца прыгадаць колішні хіт "Бонды": "Не спяшайся жыць"...

**Сяржук Вітушка**

# БРАТ ДУБЛЬ 2

Стрэмкі

## Я ЗГОДНЫ, ШТО – БРАТ. АЛЕ ЧАМУ – СТАРЭЙШЫ?

Магчыма, хтось перастане падаваць мне руку, – але я на самай справе перакананы, што расейцы, – братні народ.

Пачні я толькі пералічваць, каму з расейцаў абавязаны і ўдзячны...

Так даўно, калі быў яшчэ падлеткам з тонкай шыяй ды вялікімі вушамі, і часу меў на чытанне, толькі кароў пасучы, – трапілася анталогія расейскай паэзіі. Нявялікая такая кніжачка з пажаўцелымі старонкамі.

І адкрыўся мне дагэтуль невядомы свет. Сядзеў я на іржышчы сярод бяскрайняга поля пад выцвіла-блакітным вераснёўскім небам і чытаў:

*О сад ночной, таинственный орган*

*Лес длинных труб, приют виолончелей!*

*О сад ночной, печальный караван*

*Немых дубов и неподвижных елей!*

І доўга потым бывала: прачынаешся сярод ночы – за вакном стары хлеў у месячным святле, а ў галаве – "Лунным светом Шираз осиянен..."

Які Аркадзь Моркаўка мог з гэтым зраўняцца?..

І цяпер, напрыклад, гляджу са шкадобаю на сваіх польскіх сяброў, якія гэтай музыкі пазбаўлены, ніколі не прачытаюць, не адчуюць.

Усё так. І ўсё ж – чытаю нядаўна "откровения" аднаго расійскага гісторыка, дзе ён цвердзіць: пара, маўляў, вярнуцца да канцэпцыі "старэйшага брата" – і як цвіком па шкле.

Ці сярпом па...

Я згодны, што – брат. Але чаму – старэйшы?

Так – блізкія мы. І хораша нам сядзіцца пры чарцы – ці то "Сталічнай", ці то "Зуброўкі".

Што ж, давай тады шчыра, "начыстату".

Вядома, Моркаўка – не Блок. І мае рацыю твой пісьменнік Веллер, калі грэбліва піша: пра вашага Коласа ў якой Швейцарыі і не чуў ніхто.

Але ці ж не ты, браце, пастараўся, каб на нашым беларускім полі не толькі "моркаўкі", а і ўсе іншыя "каласы" не ўрадзілі?

Ці ж не ты падтрымліваеш і цяпер рэжым, які зноў і зноў пустошыць гэта наша спакутаванае беларускае поле?

Няхай Коласа не ведаюць у Андоры і Люксембургу. Але ён – наш. І пісаў пра мой "родны кут", а не пра "адмиралтейскую иглу". І таму ніхто яго нам не заменіць. Нават самы лепшы і вядомы, але чужы.

І не падтрымлівай ты гэтага "нашага". Не брат ён нам. Ні мне, ні табе. Бо гвалтам змушае нас цябе любіць. А ад гэтага – наадварот, варажнеча.

А я цябе і так люблю! Налівай.

Вось зайздрошчу я табе трошкі. Бо, як пераканаўча даказаў нядаўна твой пісьменнік Салуцкі ў сваёй новай кнізе "Из России с любовью", расійскі народ – "богоизбранный". Праўда, гэта будзе праз дзвесце гадоў. Але ўвогуле на свеце – толькі "два мессианских народа – евреи и русские".

А гэта значыць, проч іншага, – праз дзвесце гадоў у вас, браце, будуць, нарэшце, чыстыя прыбіральні!

Бо як вучыў Тварэц свой "избранный народ" тысячы гадоў таму: "Кроме оружия твоего, должна быть у тебя лопатка; и когда будешь садиться вне стана, выкопай ею яму и опять зарой ею испражнение твое. Ибо Господь, Бог твой ходит среди стана твоего..." ("Второзаконие", 23, 13-14)

Станеш і ты "богоизбранным", Ён і цябе навучыць гігіене!

За гэта і вып'ем!

**Алег Аблажэй**

***P.S.*** Напісаў, і захацелася перачытаць Аркадзя Моркаўку. Перачытаў – наш чалавек. Раю астатнім перачытаць.

## Невядомая Беларусь

**8 снежня** 1991 году ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы кіраўнікі Беларусі, Расіі і Ўкраіны Шушкевіч, Ельцын і Краўчук афіцыйна дэнансавалі дагавор аб утварэнні СССР і ўтварылі Садружнасць Незалежных Дзяржаваў.

**9 снежня** ў Беларусі традыцыйна ўшаноўваўся восенькі або зімовы Юр'я. Усяго Юр'яў два на год. Зімовага называлі халодным, а веснавога – галодным. Абодва яны мелі дачыненне да жывёлаў. Калі веснавы адмыкаў ключамі зямлю і сяляне пачыналі пасвіць кароў, дык зімовы, гэта значыць, сённяшні адмыкае пашчы ваўкам і крыважэрныя драпежнікі пачынаюць нападаць на свойскую жывёлу.

**9 снежня** 1891 году – дзень нараджэння Максіма Багдановіча. Хоць нарадзіўся Максім у Мінску, але большую частку свайго жыцця правёў за межамі Беларусі і памёр далёка ад радзімы. Усяго было яму адведзена 26 гадоў – столькі Багдановічу хапіла, каб стаць любімым паэтам беларусаў.

**11 снежня** 1610 году загінуў самазванец на расійскім царскім пасадзе, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Ілжэдзмітрыя ІІ-га. Гэты чалавек быў папоўскім сынам і настаўнікам у Шклове на Магілёўшчыне, калі яго захапіў вір расійскай палітычнай смуты і ўзнёс на маскоўскі трон, дзе Ілжэдзмітры прасядзеў некалькі месяцаў.

**12 снежня** 1971 году памёр Давыд Сарноф — амерыканскі пачынальнік радыё і тэлевяшчання. Нарадзіўся Давыд у Мінску і чакаў яго лёс выкладчыка талмуда, калі б сям"я ў 1900-м годзе не з'ехала ў ЗША.

**13 снежня** 1919 году Пётра Крэчэўскі стаў старшынём Рады БНР. Ад былога выпускніка віленскай духоўнай семінарыі, пасля школьнага настаўніка, а тады банкаўскага работніка патрабавалася немалая мужнасць, каб у тыя часы ўзяць на сябе адказнасць кіраўніка новастворанае дзяржавы.

## ФОТАФАКТ



**Творчая вечарына** *паэта Генадзя Бураўкіна прайшла ў перапоўненай зале Палаца мастацтваў. Да апошняга моманту імпрэза заставалася пад пагрозай зрыву, паколькі ўлады не хацелі даваць памяшканне для аднаго са старэйшых сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў. Мінск, 29 лістапада 2006 году.*

Фота «Наша Ніва»

Блакітны агеньчык

# ФАБРЫКА КЛОНАЎ

## АЛЬБО ЧАМУ ЮНЫЯ БЕЛАРУСЫ НЕ СПЯВАЮЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Цэнтральнай падзеяй на 1-м канале Беларускага тэлебачання – а значыць, і ў краіне, на мінулым тыдні стала наўпроставая трансляцыя дзіцячага конкурсу Еўрабачання з Бухарэста. Пачэснае другое месца на конкурсе заняў беларускі хлопчык Андрэй Кунец. Ён зусім крыху не дацягнуў да першага месца, якое дасталася дзявочаму дуэту з Расіі. Летась, як вядома, галоўны прыз заваявала Ксенія Сітнік з Мінска. Так што цяпер можна гаварыць пра падвойны трыюмф.

Тым больш, абодва салісты – выхаванцы дзіцячай музычнай студыі імя Мулявіна.

Праўда, не зусім зразумела, якое дачыненне мае творчасць стваральніка і саліста “Песняроў” да расійскай папсы. Але цалкам відавочна, што поспех юных дараванняў мае непасрэднае дачыненне да дзяржаўнае ідэалогіі. Гэта стала ясна з інтэрв’ю намесніка кіраўніка Белтэлерадыё Юрыя Азаронка ў “Панараме”. Перамога, паводле яго словаў, дасягнутая, па-першае, дзякуючы селекцыйнай працы самога тэлебачання, а па-другое – у выніку клопату аб выхаванні маладога пакалення з боку намесніка кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Аляксандра Праляскоўскага.



На здымку: **Поп-зорка** *Ксенія Сітнік раздае аўтографы пад наглядам сваёй маці падчас адной з фотасесіяў. Мінск, лістапад 2006 году.*

*Фота community.livejournal.com/misk_by*

Поспехі ў галіне ідэалагічнай барацьбы нельга не ацаніць. Паводле правілаў конкурсу Еўрабачання, яго ўдзельнікі павінны выканаць хаця б адну песню на мове дзяржавы, якую яны прэзентуюць. І летась, і сёлета прадстаўнікі Беларусі спявалі на расійскай мове. Відаць, еўрапейская публіка канчаткова ўпэўнілася, што адзіная дзяржаўная мова ў Беларусі – расійская. А сама краіна – рэзервацыя расійскай папсы, свайго роду запаведнік, дзе вырошчваюць гламурных клонаў расійскай эстрады.

Самі дзеці, зразумела, не вінаватыя, што іхнія таленты выкарыстоўваюць дарослыя дзядзькі ў мэтах дзяржаўнай прапаганды. Перад юнымі поп-зоркамі адкрываюцца сапраўды бліскучыя перспектывы кар’еры, магчымасць ездзіць за мяжу, не баючыся візавых абмежаванняў з боку Еўрасаюза. (Нават кіраўнік дзяржтэлерадыё Зімоўскі – і той змог нядаўна спакойна паехаць на канферэнцыю ў Партугалію, хоць ягонае імя было ўнесенае ЕС у спіс неўязных чыноўнікаў).

Праўда, не ва ўсіх беларускіх дзяцей перспектывы аднолькава бліскучыя. У Італіі, напрыклад, многім тэлегледачам сёлета запомнілася беларуская дзяўчынка Віка Мароз, якую прымусова дэпартавалі ў Мінск з-за таго, што беларускія ўлады не дазваляюць італьянскай сямейнай пары ўдачарыць яе. А каб і іншым непанадна было, Міністэрства адукацыі Беларусі ўвогуле забараніла беларускім дзецям-сіротам адпачываць у італьянскіх сем’ях – цяпер яны змогуць прыязджаць толькі ў летнія спецлагеры, дзе будуць пад асаблівым наглядам.

Дык хто застанецца сапраўдным сімвалам сённяшняй Беларусі для Еўропы – Ксенія і Андруша? Ці Віка?

**Максім Пешкаў**

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў